# НА ШЛЯХУ ДА ГЕГЕМОНІІ
# (Носов Б.В. Установление российского господства в Речи Посполитой 1756 – 1768 гг. – М.: Индрик, 2004. – 728 с.)

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Назва гэтай грувасткай кнігі досыць трапна перадае яе змест. Аўтар – намеснік дырэктара Інстытута славяназнаўства Расійскай АН – паставіў сабе за мэту спецыяльна даследваць галоўныя этапы палітыкі Расіі ў Рэчы Паспалітай (Польшчы) з пачатку Сямігадовай вайны да атрымання ёю на сейме 1767 – 1768 гг. ролі гаранта польскай канстытуцыі. Праца падзелена на 2 часткі з 16 глаў, мяжой якіх з'яўляецца сейм 1766 г., на якім Расіі не ўдалося адразу рэалізаваць свае планы.

У манаграфіі адсутнічаюць прынятыя ў такіх выпадках гістарыяграфічны агляд і заключэнне. Таму чытач вымушаны самастойна рабіць абагульненні па тых вывадах іназіраннях, якія раскіданы аўтарам па асобных главах працы. Носаў адразу адзначыў дастатковую распрацаванасць пытання пра заняпад Рэчы Паспалітай у еўрапейскай літаратуры і заявіў, што збіраецца разгледзець увесь спектр польска-расійскіх адносін 1756 – 1768 гг. для таго, каб усяго толькі "уточнить, а нередко и пересмотреть признанные концепции" (с. 9). Гэта арыентуе яго працу

якраз на эрудыраванага чытача, які знаёмы з адпаведнай гістарыяграфіяй і яе канцэпцыямі. Адну з такіх канцэпцый аўтар паказаў адразу ў выглядзе знакамітай анархіі як крыніцы заняпаду Рэчы Паспалітай і ўмяшання замежных дзяржаў. Ён не абвяргае яе і нават называе яе захаванне сярод галоўных мэт расійскай палітыкі. Аднак наступны аналіз прыводзіць Носава да высновы, што лейтматывам, стрыжнем гэтай палітыкі было імкненне Расіі атрымаць "политическое доминирование в Польше", замяніць шматбаковы міжнародны пратэктарат у адносінах да Рэчы Паспалітай на "исключительно российский" (с. 168) або дабіцца "собственной гегемонии в Речи Посполитой" (с. 62, 291).

Для доказу гэтага Носаў прыцягнуў як апублікаваныя крыніцы, так і малавядомыя дакументы з архіваў Масквы, Варшавы, Берліна, а шэраг паказальных дыпламатычных актаў змясціў у дадатку. Сярод скарыстаных крыніц тым не менш пераважаюць матэрыялы з Архіва знешняй палітыкі Расійскай Імперыі, што робіць высновы аўтара прывязанымі да прадмета аналіза і таму дастаткова абгрунтаванымі. Агляд Носавым дзейнасці знешнепалітычнага ведамства Расіі ў Варшаве, Берліне і Вене пацвердзіў распаўсюджаныя ў папярэдняй гістарыяграфіі думкі аб крызісе сістэмы міжнародных узаемаадносін, у рамках якой Расія дабілася сваіх знешнепалітычных прыярытэтаў дзякуючы звычайнаму патуральніцтву еўрапейскіх двароў. Носаў толькі падкрэслівае, што ранейшыя традыцыйныя гаранты Рэчы Паспалітай – Францыя і Аўстрыя – не "видели опасности в русской экспансии" (с. 171), а таму не імкнуліся супрацьстаяць усталяванню расійскага панавання ў рэспубліцы. Тым не менш гаварыць пра поўную міжнародную ізаляцыю Рэчы Паспалітай не дазваляюць тыя месцы ў манаграфіі, дзе аўтар піша пра апеляцыю самой Расіі да Англіі, Даніі, Швецыі ў падтрымку сваіх аднабаковых планаў.

Галоўным і самым актыўным партнёрам Расіі на яе шляху да гегемоніі ў Польшчы аказалася Прусія. Як вядома, яны разам пры ўзвядзенні на трон Станіслава Панятоўскага ў 1764 г. сакрэтна дамовіліся не дапусціць рэформ дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай. Сярод гэтых рэформ галоўным было пытанне пра замену аднагалоснасці (ліберум вета) на сеймах і сейміках на галасаванне большасцю галасоў. Носаў адзначае, што "решение о недопустимости реформ государственного строя Польши было принято в Петербурге в самом начале бескоролевья независимо от мнения Фридриха II" (с. 130, 172-173), а затым "безоговорочно принято Пруссией" (с. 62). Тым самым Носаў абвяргае распаўсюджаны ў гістарычнай літаратуры пасля Ф. Мартэнса і С. Салаўёва тэзіс аб тым, што Расія дзейнічала пад націскам Прусіі або што расійская манархіня (Кацярына II) механічна і паслухмяна рэалізоўвала чужую волю.

Сярод комплексу расійска-польскіх узаемаадносін Носаў прасочвае рэалізацыю расійскай дыпламатыяй галоўных і другарадных задач. Пры ўзвядзенні на трон васальнага ад сябе караля (Станіслава Панятоўскага), як лічыць даследчык, Расія не мела выразнай або цвёрдай праграмы, акрамя таго, што да сейма 1766 г. з дапамогай таго ж караля ёй удалося ўрэгуляваць "все второстепенные проблемы русско-польских отношений": адносна мяжы, уцекачоў, мытных пошлін за транзітны гандаль (с. 426). Таму дамаганне Расіяй у наступным праз Слуцкую, Торунскую, Радамскую канфедэрацыі і надзвычайны сейм 1767 – 1768 гг. уласнага пратэктарату над існуючым ладам Рэчы Паспалітай выглядае праявай узброенага дыктату або гвалту. Носаў ясна і выразна піша, што здабытае праз адзначаныя канфедэрацыі і сейм "господство России в Речи Посполитой основывалось исключительно на военной силе" (с. 177) або на "прямой военной интервенции" (с. 172). Тым не менш пры гэтых сцвярджэннях аўтар адыходзіць ад сваіх жа ранейшых заяў аб тым, што на ўсім працягу разгледжанага

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

часу Расія прытрымлівалася стратэгічнай лініі – адзінаўладнага гаспадарання ў Польшчы ва ўмовах яе міжнароднай ізаляцыі. Носаў не першы гісторык, які называе "дысідэнцкае" пытанне сродкам расійскай палітыкі, паколькі яно выконвала чыста інструментальную функцыю ў атрыманні "российской гарантии политической системы Речи Посполитой" і "сохранении политической анархии в Польше"(с. 614-615). Гісторык лічыць, што Расія была ініцыятарам і сфармулявала гэтае дысідэнцкае пытанне таксама "без консультации" з Прусіяй (с. 330, 331, 335). Праўда, і на гэты раз аўтар не зусім узгадняе сваю пазіцыю з аргументаванымі ім жа сведчаннямі аб тым, што расійская дыпламатыя праціскала гэтае пытанне на сейме 1767 – 1768 гг. разам з прускім, дацкім, англійскім і шведскім пасламі.

Пры разглядзе адносін Расіі са сваімі "акцёрамі" ўнутры Рэчы Паспалітай Носаў займае невыразную пазіцыю са спасылкай на цякучасць і няўстойлівасць сваіх "партызанаў" у пытаннях да намечаных каралём і яго акружэннем грамадскіх пераўтварэнняў. Як адзначае аўтар, галоўным сярод іх было знішчэнне ліберум вета і ўвядзенне галасавання на соймах і сойміках большасцю галасоў. Гэта дазваляла пазбегнуць зрываў сеймаў і стабілізаваць прававы працэс. Аднак, заўважае Носаў, гэтыя навацыі, хаця і мелі даўнюю традыцыю, выглядалі ініцыятывай караля з яго акружэннем (так званай Фаміліі), байкатаваліся расійскім бокам і не ўспрымаліся з боку шляхты. Напрыклад, даследчык сцвярджае, што напрыканцы сейма 1766 г. праціўнікі караля і Фаміліі мелі колькасную перавагу на выбарах дэлегатаў ад шляхты з-за папулярызацыі імі непахіснасці ліберум вета сярод іншых старадаўніх шляхецкіх саслоўных прывілегій. Таму робіцца незразумелым, чаму пры такім поспеху папулярныя лозунгі "не пользовались авторитетом" сярод шляхты (с. 177) або чаму, як піша Носаў, нават сама "идея реформ была чуждой для подавляющего большинства" шляхты (с. 177). З кантэксту аналізу атрымліваецца, што кароль і яго атачэнне ў сваім упартым жаданні рэфармаваць палітычны лад Рэчы Паспалітай займаліся палітычным самазабойствам, а Расія, падтрымаўшая іх, тым самым наўмысна і свядома правакавала супраць сябе настроі пратэсту ў шляхецкай карпарацыі. Адказваючы на гэтае пытанне, Носаў сцвярджае, што рэфарматарскія памкненні польскага двара атаясамліваліся радавой шляхтай з рускай палітыкай, якая была не толькі "враждебной коренным шляхетским интересам,... но опасной и для Речи Посполитой" у цэлым. Тым не менш Носаў называе парадоксам тое, што, пачынаючы з 40-х гг. XVIII ст., Расія падтрымлівала ў Рэчы Паспалітай кансерватыўныя колы, якія "питали антироссийскую оппозицию" (с. 637). Уласна, на гэтым метадалагічным назіранні і завяршаецца разглядаемы твор.

Падобныя лагічныя недарэчнасці не могуць у цэлым запляміць выдатныя якасці навуковай працы Б. Носава. Варта падкрэсліць, што расійскі даследчык адкрыта фармулюе палажэнні, якія не першы раз называюцца ненавуковымі, зняважлівымі да Расіі або русафобскімі. Насычанасць кнігі малавядомымі звесткамі, лагічнасць кампазіцыйнай будовы, аргументаванасць пазіцыі аўтара робяць даследаванне Б. Носава дастаткова аб'ектыўным і важкім укладам у разуменне абставін, прычын і перадумоў першага падзелу Рэчы Паспалітай.

*Я.К. АНІШЧАНКА,*
старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАНБ

Паступіла ў рэдакцыю 26.01.2006.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова